На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

№50 (1613)
Аўторак, 18 сакавіка 2003 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць —
5 разоў у тыдзень

Кошт свабодны.

Народная Воля

E-mail : nv@promedia.by
http://nv.promedia.by

Надвор'е

Сёння ўдзень у абласных цэнтрах чакаецца: у Мінску — +1...-1, без ападкаў; Віцебску — 0...-2, без ападкаў; Магілёве — +1...-1, снег; Гомелі — +1...+3, снег; Гродне — +1...+3, без ападкаў; Брэсце — +2...+4, снег.

Па даных сайта www.meteo.by.

Іх лёс хвалюе Беларусь

Юрый ЗАХАРАНКА



1408 дзён таму знік.

Віктар ГАНЧАР



1276 дзён таму знік.

Анатоль КРАСОЎСКІ



1276 дзён таму знік.

Дзмітрый ЗАВАДСКІ



968 дзён таму знік.

Павел МАЖЭЙКА



186 дзён абмежавання волі.

Віктар ІВАШКЕВІЧ



15 кастрычніка 2002 года Мінскі гарадскі суд пацвердзіў прыгавор Першамайскага суда — два гады абмежавання волі.

Усебеларускі сход інтэлігенцыі: задача №1 — гуртаваць сілы

640 чалавек, у тым ліку 414 дэлегатаў, удзельнічалі ў рабоце Усебеларускага сходу інтэлігенцыі, які прайшоў 16 сакавіка ў Мінску ў Палацы культуры ААТ "Сукно".

Сход адкрыўся гімнам "Магутны Божа". Потым удзельнікі форуму ўшанавалі хвілінай маўчання герояў беларускага нацыянальна-вызвольнага руху, пачынаючы з часоў Тадэвуша Касцюшкі.

Свае віншаванні Усебеларускаму сходу інтэлігенцыі накіравалі старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі Івонка Сурвілла, лідэр Кансерватыўна-хрысціянскай партыі — БНФ Зянон Пазьняк, першы віцэ-прэзідэнт Беларускага ПЕН-цэнтра Карлас Шэрман (ён зараз знаходзіцца на лячэнні ў Нарвегіі), а таксама чацвёра арыштаваных арганізатараў Народнага маршу "За лепшае жыццё!", які прайшоў у Мінску 12 сакавіка, — Людміла Гразнова, Андрэй Саннікаў, Зміцер Бандарэнка і Леанід Малахаў.

Паэт Генадзь Бураўкін зачытаў удзельнікам форуму зварот народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава.

Нацыянальная інтэлігенцыя, адзначаецца ў звароце, не мае маральнага права патрабаваць змяненняў ад іншых да той пары, пакуль сама не пачне больш крытычна ставіцца да сябе. На думку Васіля Быкава, калі электарат не здольны "развязаць заклятыя праблемы" жыцця грамадства, гэта давядзецца рабіць "яго эліце — правай і левай, нацыянальнай і дэмакратычнай, радыкальнай і ліберальнай".

Пісьменнік заклікаў беларускую інтэлігенцыю да яднання. "Мы надта слабыя, каб дзейнічаць паасобку, каб доўга вагацца, выбіраць і перабіраць... Бо ў адваротным выпадку нас хутка не стане — ні правых, ні левых, ні песімістаў, ні аптымістаў, ні праведнікаў, ні вінаватых", — гаворыцца ў звароце Васіля Быкава.

Беларуская інтэлігенцыя заклікала прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнку звярнуцца да вопыту дэмакратычных пераўтварэнняў у цывілізаваных дзяржавах і распачаць канструктыўны дыялог з прадстаўнікамі ўсіх палітычных плыняў грамадства. Пра гэта гаворыцца ў рэзалюцыі, прынятай удзельнікамі першага Усебеларускага сходу інтэлігенцыі, які прайшоў у Мінску 16 сакавіка.

У якасці першага кроку на гэтым шляху ўдзельнікі сходу прапанавалі вызваліць зняволеных журналістаў Віктара Івашкевіча і Паўла Мажэйку, зняць з іх і журналіста Мікалая Маркевіча судзімасці, перагледзець справу вядомага вучонага Юрыя Бандажэўскага і прыняць неадкладныя захады да ўсебаковага расследавання спраў аб знікненні Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага, Дзмітрыя Завадскага і Юрася Корбана.

Удзельнікі сходу інтэлігенцыі выступілі "катэгарычна супраць працягу паўнамоцтваў цяперашняга кіраўніка Беларусі пасля 2006 года". Беларуская інтэлігенцыя абвясціла аб намеры зрабіць усё, "каб выбары новага парламента ў 2004 годзе і новага прэзідэнта ў 2006 годзе адбыліся згодна з новым Выбарчым кодэксам, у адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі, без адміністрацыйнага націску на выбаршчыкаў і кандыдатаў, без махінацый і падтасовак падчас галасавання, каб народ Беларусі змог зрабіць свядомы і асэнсаваны выбар".

Удзельнікі сходу выказалі рашучы пратэст супраць "любых спроб здачы незалежнасці, дзяржаўнага суверэнітэту нашай краіны, дыскрымінацыі беларускай мовы" і заявілі аб сваёй гатоўнасці "абараняць гэтыя святыя для кожнага грамадзяніна Беларусі каштоўнасці ўсімі магчымымі сродкамі".

"Усведамляючы сваю асабістую адказнасць за лёс Бацькаўшчыны і разумеючы неабходнасць пошуку арганізацыйных шляхоў да выканання пастаўленай задачы", удзельнікі сходу надалі аргкамітэту паўнамоцтвы каардынатара іх дзейнасці, даручылі яму выступаць ад іх імя, прадстаўляючы інтарэсы ў Беларусі і за яе межамі, а таксама збіраць на сход у выпадку крытычнай для беларускага грамадства сітуацыі".

Аргкамітэту даручана стварыць Раду беларускай інтэлігенцыі, у якую павінны ўвайсці ўсе яе "аксакалы".

Марат ГАРАВЫ, Вольга ЛАПІКАВА.

СУБ'ЕКТЫЎНЫЯ НАТАТКІ

Якая місія ў місіі АБСЕ?

Чатыры грамадзяніны Беларусі Людміла Гразнова, Зміцер Бандарэнка, Андрэй Саннікаў і Леанід Малахаў, згодна з класіфікацыяй праваабарончай арганізацыі "Міжнародная амністыя", сталі ў канцы мінулага тыдня "вязнямі сумлення". Як вядома, іх кінулі за краты на пятнаццаць сутак.

Здзіўляе пазіцыя ў гэтым пытанні Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ), чыя місія вось ужо два месяцы нібы працуе ў Мінску. Сутнасць такой пазіцыі, на мой погляд, — гэта адсутнасць зразумелай пазіцыі. Рэжым Лукашэнкі ў чарговы раз растаптаў правы чалавека, а місія АБСЕ — ні слова...

Стамілася вока, шчыра кажучы, шукаць у натоўпе сярод удзельнікаў Народнага маршу "За лепшае жыццё!" прывычныя безрукаўкі з сінімі літарамі "OSCE". Не знайшоў. Не прысутнічалі еўрапейскія назіральнікі і на наступны дзень у судзе Савецкага раёна, дзе вяршылі "судзілішча" над Гразновай, Бандарэнкам, Саннікавым і Малахавым.

Можа, новы кіраўнік місіі АБСЕ Эбергард Хайкен нічога не ведаў пра акцыю пратэсту і пра суды? Ды не! Як паведамляе прэс-цэнтр "Хартыі-97", прадстаўнікі незарэгістраванага маладзёжнага руху "Зубр" за некалькі дзён да маніфестацыі перадалі яму персанальнае запрашэнне наведаць маніфестацыю і назіраць за магчымымі рэпрэсіямі ў адносінах да яе ўдзельнікаў.

Я вырашыў звязацца з самім спадаром Хайкенам, каб даведацца пра яго думкі адносна дадзенага пытання. У мінскім офісе АБСЕ праз кожныя паўгадзіны мяне прасілі патэлефанаваць яшчэ раз, паколькі "кіраўнік місіі на чарговай сустрэчы" і адказаць не можа. Нарэшце, пасля чатырох гадзін аўтадазвону з офіса місіі АБСЕ прыйшоў адказ па факсе, у якім нас праінфармавалі, што марш "За лепшае жыццё" наведалі намеснік кіраўніка місіі і яшчэ адзін супрацоўнік офіса АБСЕ, пацвердзілі, што прадстаўнікі АБСЕ не прысутнічалі на пасяджэннях суда, калі "раздавалі суткі" арганізатарам акцыі, а таксама паведамілі, што "офіс АБСЕ будзе выкарыстоўваць сваё права назірання ў будучым і будзе прымаць тую ці іншую пазіцыю, калі гэта спатрэбіцца".

Што і казаць, цікавую форму назірання за масавымі акцыямі вызначылі ў офісе АБСЕ. Прадстаўнікі місіі як быццам і прысутнічаюць падчас правядзення той жа маніфестацыі, але іх ніхто не заўважае. Калі сам від безрукавак з назвай АБСЕ як паветра патрэбен у якасці стрымліваючага фактара для міліцыі, "гераізм" якой часта заключаецца ў збіцці людзей, вось гэтых безрукавак я і не бачыў.

Складваецца ўражанне, што ў АБСЕ прынялі цвёрдае рашэнне супрацоўнічаць з беларускімі ўладамі і ні ў якім выпадку не ісці з імі на канфрантацыю.

А як жа быць з прынцыпамі, мэтамі АБСЕ? На яе афіцыйным інтэрнет-сайце, напрыклад, чытаю: "болей за 4000 супрацоўнікаў АБСЕ ў краінах Цэнтральнай Азіі, Каўказа, Паўночна-Усходняй і Усходняй Еўропы прызваны "на месцы" садзейнічаць палітычным працэсам, прадухіляць ці рэгуляваць канфлікты, прасоўваць дэмакратыю і прынцыпы верхавенства закона".

Дык дзе можна абараняць дэмакратыю, калі не падчас працэсу адкрытага парушэння правоў чалавека? Можа, у Адміністрацыі прэзідэнта ці ў боўлінг-клубе? Вопыт зносін міжнародных структур з нашымі ўладамі ўжо не адзін раз дэманстраваў, што апошнія адкрыта чхаюць на ўсе заклікі і рэкамендацыі.

Знаходжу раздзел "Навіны АБСЕ" на яе афіцыйнай інтэрнет-старонцы. Думаеце, хоць радок ёсць пра чарговых "вязняў сумлення" ў Беларусі? Ні слова. За першыя суткі пасля акцыі ў Мінску ў гэтым раздзеле з'явілася сем навін: пяць з іх прысвечаны забойству прэм'ер-міністра Сербіі Зорана Джынджыча, адна — прызначэнню новага эмісара АБСЕ ў Цэнтральнай Азіі і яшчэ адна — "кругламу сталу" ў Таджыкістане, на якім абмяркоўваліся праблемы доступу моладзі да інфармацыі. Пра Беларусь — ні гу-гу!

Яскрава памятаю нядаўні візіт у Беларусь прадстаўніка Парламенцкай Асаблеі АБСЕ Уты Цапф. У адзін з вечароў для нас, прадстаўнікоў прэсы, арганізавалі сустрэчу з еўрапейскім эмісарам, на якой мы мусілі распавесці ёй аб праблеме свабоды слова на Беларусі. Рамуальд Улан, галоўны рэдактар закрытай "Новай газеты Смаргоні", літаральна прыляцеў на гэтую сустрэчу на ўласным аўто ў мяцеліцу за 150 кіламетраў. На ўсё жыццё я запомніў абыякавыя вочы сп. Цапф. Яна час ад часу курыла, нешта закапвала ў нос, ёрзала на крэсле альбо наогул пакідала памяшканне, калі хто-небудзь з маіх калег распавядаў пра жудасныя факты парушэння свабоды слова...

Пасля гэтага візіту нашу "палатку" прынялі ў ПА АБСЕ. А зноў адкрытая місія АБСЕ ў Мінску пасля доўгага і нуднага гандлю з уладамі наконт свайго статусу, здаецца, ніяк не можа "раскочегариться" і зрабіць нешта запамінальнае, пасапраўднаму карыснае для ўсталявання дэмакратыі ў Беларусі.

Лічу, што для новых супрацоўнікаў місіі АБСЕ час распакоўваць чамаданы ўжо прайшоў. Інакш навошта марнаваць грошы еўрапейскіх падаткаплацельшчыкаў, робячы выгляд, што Еўропа за нечым назірае ў Беларусі?

Алесь СІЛІЧ.
Фота IREX/ProMedia.

За палец — 900 тысяч рублёў

У адзін са студзеньскіх дзён жанчына ехала ў аўтобусе № 3. Ля прыпынку "Сыраробны камбінат" аўтобус нечакана спыніўся — па ходу руху перад ім стаяў сустрэчны аўтамабіль. У гэты час побач праходзіў грузавік, які сваім кузавам зачапіў аўтобус. У выніку грамадзянка Н., якая сядзела каля акна, зламала фалангу вялікага пальца левай рукі і страціла працаздольнасць.

Як высветлілася ў судзе, вадзіцель і кандуктар аўтобуса №3 не толькі не гарантавалі бяспеку Н., але і не аказалі ёй першую дапамогу. Акрамя таго, суд палічыў неабходным прыцягнуць да матэрыяльнай адказнасці і ўладальніка аднаго з аўтамабіляў ААТ "Слуцкі цукрова-рафінадны камбінат", які сутыкнуўся з аўтобусам.

У выніку на карысць грамадзянкі Н. з вінаватых было спагнана ў агульнай суме каля 900 тысяч рублёў.

Сяргей СТАНКЕВІЧ.

ПУЛЬС

У «ЗУБРа» ўкралі інфармацыю

У ноч на 15 сакавіка невядомыя абрабавалі кватэру, у якой знаходзіцца прэс-цэнтр нефармальнага маладзёжнага руху "Зубр".

Як паведамілі БелаПАН прадстаўнікі руху, злачынцы трапілі ў кватэру, размешчаную на першым паверсе, праз акно, перапіліўшы краты і адагнуўшы пруты. Выкрадзены сістэмны блок камп'ютэра, на якім утрымлівалася важная інфармацыя. Больш у кватэры нічога не кранута.

Ірына ЛЕЎШЫНА.

На свободу!

Грамадскія і праваабарончыя арганізацыі заклікаюць беларускія ўлады вызваліць з-за крат арганізатараў маршу 12 сакавіка. У заявах, распаўсюджаных шэрагам арганізацый, выказваецца пратэст супраць зняволення арганізатараў акцыі "За лепшае жыццё!" Андрэя Саннікава, Людмілы Гразновай, Зміцера Бандарэнкі і Леаніда Малахава.

Аляксей ШЭІН.

Пагасіць запазычанасць па зарплаце да 1 мая

У адпаведнасці з рашэннем Мінскага гарвыканкама, сталічныя прадпрыемствы, якія маюць запазычанасць па заработнай плаце, павінны пагасіць яе да 1 мая. Акрамя таго, ім прадпісана "зрабіць вычарпальныя захады па стабілізацыі ў цэлым эканамічнай сітуацыі".

Як паведаміла БелаПАН начальнік камітэта па працы і сацыяльнай абароне гарвыканкама Ірына Аляксанава, на 14 сакавіка запазычанасць па зарплаце склала 373,7 млн. рублёў. Яе маюць прадпрыемствы "Чаўляр", "Рэйліт", "ЛеГранд", "Адамас БДУ", "Алеся", "ЭКБ машынабудавання", "Рамжылбуд", "Мінская друкарня Кіраўніцтва справамі прэзідэнта Рэспублікі Беларусь", будаўнічае прадпрыемства "ПМК-1". Як адзначыла І.Аляксанава, з пачатку месяца запазычанасць знізілі толькі "Алеся", "Рэйліт" і "ПМК-1" (на агульную суму 32,3 млн. рублёў).

Лавінія АРЭШКА.

Студэнт загінуў у ліфце

Страшная трагедыя адбылася раніцай 17 сакавіка ў будынку інтэрната № 4 Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта (БДТУ), размешчанага на вуліцы Беларускай у Мінску.

19-гадовы студэнт другога курса БДТУ быў заціснуты ў ліфтавой кабіне на восьмым паверсе 13-павярховага будынка. Хутчэй за ўсё, малады чалавек уваходзіў у ліфт, калі той нечакана пачаў рух. Верхняя частка ліфтавой кабіны апусцілася на студэнта, які яшчэ не паспеў поўнасцю ўвайсці ў ліфт. Усё адбылося настолькі імкліва, што ў хлопца не засталося часу, каб выскачыць з ліфта.

У выніку моцнага ўдару малады чалавек памёр. Студэнт ВНУ быў ураджэнцам Смаргоні.

Дзмітрый БЕЛЬСКІ.

У апошні час не выходзіць з галавы думка: а чаго гэта А.Лукашэнка, які кіруе краінай дзевяты год і пры якім ніхто з малых і высокіх чыноўнікаў самастойна пальцам не паварушыў, раптам спахапіўся, што ўрад заваліў праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця дзяржавы, уздыбіў цэны, як цыган шалёнага каня, і тым самым накінуў намыленую вяроўку на шыю сацыяльна не абароненых і быццам бы абароненых бедных людзей?

Паніка

Васіль ГРОДНІКАЎ

Чаго ў Адміністрацыі прэзідэнта і ва ўрадзе адказныя супрацоўнікі, як тыя каровы ў спякотны поўдзень, авадднямі пакусаныя, носяцца, як угарэлыя? Чаго гэта міністры і шматлікія падміністры, чыноўнікі ўладаносных рангаў гэтак пільна ўглядаюцца ў рот сваім вышэйшым начальнікам, лётаюць па краіне, не баючыся нават забруджаных радыяцыяй раёнаў, усё вынюхваюць, адшукваюць нейкія рэзервы? Чаму залятаюць нават на расійскія тэрытарыяльныя землі і там нешта шукаюць? Нашы снуюць у Маскву, а іхнія з Масквы — да нас?

Чаму раптам пачалі аб'яўляць конкурсы на продаж "апошняй нацельнай кашулі", г.зн. распродажу расійскім алігархам вельмі важных дзяржаўных аб'ектаў? Якая муха іх укусіла, які нячысцік падбухторвае? Па ўсім відаць, горача стала ў дзяржаўных колах, быццам у перагрэтых урадавых саунах. Пацеюць, ёрзаюць чынушы, быццам іх, голых і босых, прымусілі танчыць на чырвоных вуголлях. Няўжо ўрадавыя структуры і вышэйшае чынавенства гэтак занепакоілася за лёс Бацькаўшчыны (хоць якая яна, да д'ябла, ім Бацькаўшчына) ці за сваю скуру забаяліся? Ці можа А.Лукашэнка, абвінавачваючы ўрад ва ўсіх грахах, абураючыся, што той давёў народ да галечы, звальвае віну з хворай галавы на здаровую, выгароджвае сябе, бо, як мы ведаем, ён — аўтар ідэі пабудовы ў асобна ўзятай краіне пад назвай Беларусь "рынкавага сацыялізму", які і з'явіўся першапрычынай катастрофы сацыяльна-эканамічнага стану краіны?

Аказваецца, тут асабліва няма над чым і галаву ламаць. Як і вада пра ахаладжэнні даходзіць да кропкі замярзання, так і ў сацыяльна-эканамічнай сістэме вось-вось утворыцца ледзяная пробка і яна, гэтая сістэма, узляціць у паветра, як ад разрыву магутнай чэчэнскай бомбы. Або застыне і ашчэрбіцца, як ацяпляльныя трубы ў шматлікіх расійскіх рэгіёнах. А вы ж памятаеце, як яшчэ нядаўна і Лукашэнка, і ўрад пераконвалі, выхваляючыся, што наша эканоміка на ўздыме, перажывае што ні на ёсць эканамічны бум накшталт "японскага цуду". (Яшчэ не злавілі, а ўжо скублі пер'е!) А на самай справе мадэль "рынкавага сацыялізму" была ўся ў дзірках, як рэшата. Нарэшце шыла вылезла з мяшка — сістэма дайшла-такі да "кропкі замярзання". Вось тут і пакаціўся па твары адказнага за ўсё, што робіцца ў нашым краі, халодны пот.

Вобразна кажучы, першым да фінішу, як трэба было прадбачыць, ведаючы яго спартыўныя схільнасці, прыбег А.Лукашэнка. І спахапіўшыся, што народ можа адгадаць вінаватага і тым больш ускласці віну за такое гаротнае становішча на яго самога, хуценька арганізаваў галавамыйку ўсяму ўраду ў прэзідэнцкай "лазні" на К.Маркса, 38. Праўда ці не, сцвярджаць не бяруся, але дасведчаныя людзі шапталіся, што назаўтра тую "лазню" зачынілі на санапрацоўку. Санітары і прыбіральшчыцы з "Чырвонага дома" працавалі да сёмага поту...

Ну, што тут скажаш? Я таксама не на жартачкі раззлаваўся б, калі б адчуў, што на мяне накатваецца такі вялікі снежны камяк. Замест шасці працэнтаў росту валавога ўнутранага прадукту па прагнозах ён аказаўся карацейшым аж на два працэнты. Ды і па вялікім рахунку веры даць нават гэтаму росту нельга, таму што крэдыторская запазычанасць вытворцаў узрасла на 2,6 трыльёна рублёў. Гэта значыць, што ўсяго той запазычанасці назбіралася звыш 11 трыльёнаў. А запазычанасць прадпрыемстваў рэальнага сектара выскачыла, як гузак на лбе, аж на паўсотню працэнтаў.

Склады забіты таварамі, пляцоўкі застаўлены станкамі, трактарамі, машынамі, іншым абсталяваннем — мыш не праціснецца. А збыць няма каму: нікудышняя прадукцыя. Адсюль і грошай у казне, як мышэй у пустым свірне. Не дарма ж аддаваць. Дарма аддаваць могуць толькі багатыя краіны ці такія, як былы СССР, які направа і налева раздаваў грошы і тэхніку недаразвітым краінам на падпал сусветнай пралетарскай рэвалюцыі. Так што, мяркуюць ва ўрадзе, няхай пакуль што ўсё гэта паляжыць, пастаіць, пакуль не паржавее. Можа і знойдзецца некалі той, хто захоча ўсё гэта купіць. Свет жа не без дурняў. Вам жа скажу "па-сакрэту": нядаўна самы высокі чыноўнік прагаварыўся, што на складах ляжыць прадукцыі больш як на трыльён рублёў.

А ў цэнах і на канвеерах што творыцца?! Данасілася ўсё. На чэсным слове трымаецца. Якая тут можа ісці размова пра найноўшыя тэхналогіі, калі больш-менш талковае абсталяванне было дабіта яшчэ пры гарбачоўскім паскарэнні. А тое, што засталося, даўно пара выкінуць на звалку. У сярэднім 80 працэнтаў такога абсталявання сумуе па сметніку. Добрая палова прадпрыемстваў — стратныя. І што, мы на такой тэхніцы і царагарохаўскай тэхналогіі маем намер выпрабляць прадукцыю, якую на Захадзе адарвуць з рукамі? Дзякуй Богу, можа цяпер тое-сёе ўдасца спіхнуць у Расію, у Казахстан, ва Украіну, улічваючы апошнія найвышэйшыя дамоўленасці ў Маскве па стварэнні агульнай эканамічнай прасторы і агульнадаступнага для гэтых краін рынку. Праўда, тут куры і індыкі чамусьці аднесены да адной пароды.

І сяло, ліха на яго, дало прыбаўку — кот наплакаў — усяго 0,2 працэнта. І гэта называецца, што вёска аддзячыла дзяржаве за вагоны грошай, што накіроўваліся на ўздым сельскай гаспадаркі? Вагоны з грошыкамі, як заўсёды, забулькалі ў гноева-жыжавых сажалках ля жывёлагадоўчых ферм і комплексаў разам з дохлымі каровамі, цялятамі, парсюкамі. Адным словам, у чарговы раз плакалі народныя грошыкі... Так, на царскім дворышчы — паніка. Але ж ці ўпершыню гэта? Колькі на нашай памяці было такіх спектакляў? Ці не пара мяняць "артыстаў", шаноўныя грамадзяне?

АНОНС!

Задумаемся с Александром Ольховым...

1994—2003.

Сколько статей написано за эти годы о правлении Александра Лукашенко! Пора подводить и некоторые итоги.

За это взялся известный публицист **Александр ОЛЬХОВОЙ**.

В сегодняшнем и ближайших номерах (3—4-я стр.) — его серия публикаций по острейшей проблеме дня: чего добились, куда идем, куда нас ведут?

Вместе с Александром Ольховым задумаемся...

ПУЛЬС



Іна ЖУКАВА заняла трэцяе месца на спаборніцтвах па мастацкай гімнастыцы. Кіеў, сакавік 2003 г.

Фота IREX/ProMedia.

Прадаеш тавар — дай інфармацыю на беларускай мове

Аб парушэнні правоў спажыўцоў, якія штодзённа карыстаюцца дзяржаўнай беларускай мовай, заявіў старшыня "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" Алег Трусаў на прэс-канферэнцыі, прысвечанай Дню абароны правоў спажыўцоў.

"Айчынныя і замежныя тавараытворцы амаль не ўжываюць беларускую мову ў афармленні прадукцыі, — сказаў А.Трусаў. — Рэдка сустракаюцца беларускамоўныя інструкцыі па карыстанні складанымі бытавымі прыборамі. У рабоце прадпрыемстваў сферы паслуг, у тым ліку тэлефонных службаў, аператараў сотавай сувязі і нейкіх інфармацыйных кампаній таксама не выкарыстоўваецца мова тытульнай нацыі".

Марат ГАРАВЫ.

Будзе па вуліцы Платонава бізнес-цэнтр

У верасні ў Мінску на перакрыжаванні вуліц Платонава і Чапаева плануецца пачаць будаўніцтва бізнес-цэнтра. Яго эскізны праект ухвалены на пасяджэнні камітэта архітэктуры, горадабудаўніцтва і землеўпарадкавання Мінгарвыканкама.

Як паведаміў архітэктар праекта Алег Лашакевіч, гэта будзе шасціпавярховы будынак агульнай плошчай 19 тысяч квадратных метраў з падземнай двухузроўневай аўтастаянкай на 200 аўтамабіляў. Першыя паверхі бізнес-цэнтра, у адпаведнасці з пажаданнямі новага генеральнага плана Мінска, будуць аддадзены пад аб'екты з гарадскімі функцыямі, на астатніх размесцяцца офісы.

Лавінія АРЭШКА.

Сядзібу Тадэвуша Касцюшкі — на рэстаўрацыю

Пасольства ЗША ў Беларусі прапанавала сваю дапамогу ў рэстаўрацыі сядзібы Тадэвуша Касцюшкі, размешчанай у Івацэвіцкім раёне Брэсцкай вобласці.

Як паведаміў БелаПАН інспектар па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Брэсцкага аблвыканкама Леанід Несцярчук, пра гэта заявіў палітычны саветнік пасольства ЗША ў Беларусі Тэд Контэк на пасяджэнні рабочай групы па аднаўленні сядзібы Касцюшкі. Пасяджэнне праходзіла на чале з намеснікам старшыні Брэсцкага аблвыканкама Леанідам Цупрыкам.

Паводле слоў Несцярчука, грошы на рэстаўрацыю ў памеры да 30 тысяч долараў могуць быць выдзелены ўжо ў наступным месяцы. Для гэтага трэба прадставіць амерыканскаму боку канкрэтны план работ. Яшчэ адной умовай з'яўляецца ўдзел у праекце недзяржаўных арганізацый.

Рашэнне аб рэканструкцыі сядзібы Тадэвуша Касцюшкі — вядомага палітычнага і ваеннага дзеяча Рэчы Паспалітай, кіраўніка нацыянальна-вызваленчага паўстання 1794 года, ганаровага грамадзяніна Францыі, нацыянальнага героя ЗША і Польшчы — было прынята Брэсцкім аблвыканкамам у канцы мінулага года.

Валянціна КАЗЛОВІЧ.

Яшчэ адзін беларускі тэлеканал

Восенню гэтага года на базе абласных тэлерадыёаб'яднанняў пачне працу новы тэлеканал. Пра гэта паведаміў старшыня Белтэлерадыёкампаніі Ягор Рыбакоў на прэс-канферэнцыі ў Гродне.

Старшыня кампаніі паведаміў, што генеральным дырэктарам новага тэлеканала прызначаны старшыня Віцебскага тэлерадыёаб'яднання Аляксандр Семярнёў. Вяшчанне новага тэлеканала будзе ажыццяўляцца на частотах, на якіх выходзяць абласныя тэлерадыёаб'яднанні, — гэта значыць, галоўным чынам на частотах тэлеканала "Культура".


"З майго пункту гледжання, вяшчанне расійскіх каналаў будзе памяншацца з той жа паслядоўнасцю, наколькі хутка будзе развівацца нацыянальнае вяшчанне", — сказаў Рыбакоў.

Ірына ЧАРНЯЎКА.

СЛУЧАЙ

Врачебная ошибка?

Человеку свойственно ошибаться. Врачи тоже люди. И тоже ошибаются. По незнанию, по случайности, по невнимательности. Но врачебная ошибка иногда может стоить пациенту здоровья, обернуться искалеченной судьбой, а порой и самым страшным — смертью.



В США ежегодно свыше 10 тысяч человек умирают от врачебных ошибок. А у нас? В Министерстве здравоохранения на этот вопрос никто не может дать ответа. Потому что в Беларуси не ведут статистики врачебных ошибок. И потому, говорят чиновники Минздрава, очень сложно доказать, где ошибся врач, а где виноват сам пациент.

В одном небольшом городе Беларуси прямо в больнице умер мужчина 60 лет. Родственники умершего винят во всем медиков: были невнимательны, не оказали вовремя помощь. Врачи от комментариев отказываются, ссылаясь на то, что нет официального ответа из областного Управления охраны здоровья по факту смерти. В данный момент история болезни находится в Управлении, и только после 25 марта комиссия областного Управления охраны здоровья вынесет заключение.

...Вечером 2 января Александру Васильченко (фамилия изменена) стало плохо. Боль в животе усиливалась, но он терпел, не вызывал "скорую". Несколько таблеток но-шпы не помогли, и жена, несмотря на протесты Александра, вызвала "скорую". Обезболивающий укол, который сделала приехавшая бригада, тоже не помог. В 7 утра уже сам Васильченко позвонил в "скорую" и настоял, чтобы его отвезли в больницу.

"Александра привезли в приемный покой, — рассказывает жена Наталья. — Медсестра сказала, что надо идти на прием к хирургу в поликлинику, она расположена в здании рядом. Кабинет хирурга находился на втором этаже. У мужа не было сил подняться, я буквально тащила его на своих плечах. Приема мы ждали два часа. Хирург предположил острый аппендицит".

Диагноз подтвердился, и Александра Васильченко прооперировали в тот же день. Операция длилась 3 часа. Через сутки больного перевели в общую палату, и, казалось, опасность миновала.

"Но на четвертый день из раны пошел гной, поднялась температура, — продолжает свой рассказ Наталья. — Повязка была мокрой, липкой. Тем не менее только через три дня дежурный, а не лечащий врач вскрыл шов и почистил рану.

Выяснилось, что в рану занесли инфекцию, у мужа начался перитонит. Но в отделении все были спокойны. Александра перевели из палаты в холл, сказав, что нет мест. А ему становилось все хуже и хуже. Открылось кровотечение. Кровь шла сгустками. Я побежала к медсестре, но она сказала, что ничего страшного, так нужно, это очищается организм. И только тогда, когда я из-под мужа достала вторую "утку" с кровью, медики забегали, заказали кровь, плазму и стали их вводить.

Состояние Александра ухудшалось, кровотечение не прекращалось, давление падало. Наконец 15 января лечащий врач обратился за консультацией к минским специалистам. 16-го вечером мужа забрали в операционную, должна была приехать бригада из Минска. В те дни на улице был страшный гололед, помощь из столицы запаздывала. В час ночи 17 января моего мужа не стало".

Наталья Васильченко винит в смерти мужа врачей. Не только лечащего доктора. "Он молодой, только что после института, и, конечно, у него еще нет должного опыта, — говорит она. — Но где были старшие коллеги? Если не знали, как поступить, почему так поздно обратились за советом к врачам из Минска? Мне казалось, что врач всегда должен думать о пациенте, а не о своих профессиональных амбициях". Обратиться в газету Наталье Александровне посоветовали сами медики, те, кто, как говорит она, наблюдали за происходящим со стороны. И кто, соблюдая субординацию, не мог подсказать коллегам, как надо действовать.

Заместитель главврача по медицинской части, которая согласилась поговорить с журналистом, просила не называть их медицинское учреждение. "Еще нет заключения комиссии областного Управления охраны здоровья, и не хотелось бы, чтобы жители прочитали такой негативный материал о единственной больнице в городе, — сказала она. — А этот случай действительно вызвал большой резонанс. Больной поступил в больницу с острым аппендицитом. Ему была оказана соответствующая помощь: делалось все, что нужно в этой ситуации. Но после операции возникло осложнение — острая язва желудка, и как следствие — кровотечение. Доктор, который дежурил в тот момент в больнице, — пенсионер. Он отказался идти на операцию. Бригада санавиации из Минска, которую мы вызвали, не успела приехать. Пациент умер. После смерти было произведено вскрытие. Сейчас история болезни находится в обласном Управлении охраны здоровья. Предварительное рассмотрение истории указывает на то, что медики действовали правильно".

***

Разобраться в этом деле непросто. У вдовы Александра Васильченко, его детей своя правда. У врачей — своя. Но в кулуарах больницы говорят, что это уже не первый экстремальный случай в этом медицинском учреждении. Правда, раньше больных удавалось спасти. И, наверное, сегодня те, кому неправильно лечили перелом ноги или осложнения после перелома, рады, что хоть с палочкой, но могут ходить.

Проблема в том, что в этой районной больнице не хватает специалистов, обеспеченность врачебными кадрами — 50%. Самый опытный хирург работает только седьмой год после института. В той же Германии, например, выпускник медицинского университета должен 10 лет набираться опыта у старших коллег, прежде чем ему разрешат самостоятельно выполнять операции.

В райцентре практически не строят жилье. Если посчитать, сколько хороших специалистов покинули райцентр из-за неустроенного быта за последние 10 лет, не хватит пальцев обеих рук.

Проблема и в том, что маленькие районные больнички не оснащены современным оборудованием и врачи, будь они хоть семи пядей во лбу, не всегда могут точно определить диагноз. Уходит время, болезнь прогрессирует. Да и потенциальные пациенты далеко не всегда "грешат" должным вниманием к своему здоровью. Зачастую к медикам они обращаются тогда, когда уже теряют сознание от боли, и до последнего сопротивляются попыткам родных вызвать "скорую"...

Поначалу Наталья Васильченко хотела обратиться в суд. Но ее желание воевать с медиками с каждым днем ослабевает. Женщина считает, что, если бы дело касалось платной медицины, было бы проще найти виноватых. При бесплатной медицине не всегда удается компенсировать даже моральный ущерб.

"Врачи имеют право на риск при оказании медицинской помощи, — так прокомментировал ситуацию бывший министр здравоохранения **Игорь Зеленкевич**. — Однако для компенсации неизбежного в таких случаях ущерба здоровью пациентов необходимо заранее страховать профессиональную ответственность врачей. А это значит, что должен быть принят закон об обязательном страховании профессиональной ответственности медицинских работников, как это сделано во многих странах мира. Если хирург дежурит вторые сутки — как он справится со своими обязанностями и каковы его права? И есть ли у него в этом случае право на ошибку?

Необходимо как можно скорее принять и закон о правах пациентов. В мою бытность министром мы планировали вынести на рассмотрение такие законы. Но наша инициатива не была поддержана. А ведь необходимость в этом назрела. Сегодня пациент чем руководствуется? Общегражданским кодексом, иногда может прибегнуть к Уголовному кодексу, где говорится о халатности врачей. Но должен быть закон, который регламентирует принципы возмещения ущерба, нанесенного пациенту. Это все прописано в различных ведомственных и подзаконных актах, а закона нет.

Я считаю, что всегда, когда у родственников есть какое-то сомнение, дело должно разрешаться в суде. Родственники не должны обивать пороги многочисленных инстанций. В таком случае врачу могут вынести выговор, депримировать, но не лишить диплома, не перевести на более низкую должность. И это вызывает недоумение. Ведь по халатности, по недосмотру врача человеку искалечили судьбу, а иногда и лишили жизни".

Мария ЭЙСМОНТ.

ВИДИТ ОКО

Представьте себе: на иностранца падает балкон...

Приезжает иностранец в столицу нашей славной родины, поселяется в роскошной гостинице "Минск" и каждый день, выходя из нее, видит щит с планом реконструкции площади Независимости. Ходит интурист по Минску и диву дается: растет город, хорошеет...

Но в один прекрасный день идет этот иностранец по улице Володарского и на него падает... балкон. "Что за глупость?" — спросите вы. А ведь это суровый закон физики: если балкон начинает разваливаться по частям, он со временем может рухнуть целиком. А разваливающихся балконов по названной улице немало.



Уже более четырех лет жители домов №10 и №12 по улице Володарского бьются с различными инстанциями, такими как ЖЭСы и ЖРЭУ, чтобы провели капитальный ремонт их жилищ. Дома старые: фундамент с 1917 года, а реконструировались они в последний раз в 1945-м году.

Клавдия ИВАНОВА, жительница 6-й квартиры дома №12:

— Мы обращаемся в разные инстанции с просьбой провести ремонт, но получаем только отписки: мол, подождите немного и все будет решено. Никто ничего не хочет делать. А пять лет назад нас еще лишили двора — после того, что его намного уменьшили (областной суд оттяпал себе почти половину), так то, что осталось, превратили в автостоянку.

Часть дома отдана под офисы, и работники всех учреждений ставят свои подержанные чудеса техники под окна домов, чем, естественно, очень нервируют жильцов.

Мы уже и в ГАИ обращались. Хоть бы знак повесили, запрещающий стоянку, или штрафовали кого-нибудь, так ведь ничего не делают.

Клавдия Петровна посоветовала мне обратиться к соседям сверху: "Спросите у Светланы Семеновны из 5-й квартиры, она вам больше расскажет!". У тех, кроме классических в данной ситуации претензий, что никто и не думает делать капитальный ремонт, есть еще одна проблема: протекает крыша.

Светланы Семеновны не было, открыл сын Сергей.

Сергей ЛЯДНОВИЧ:

— Квартиры у нас хорошие: высокие потолки, большие комнаты, но у нас несколько лет протекает крыша. Во время сильных дождей приходится ставить тазики. Странно, как еще короткое замыкание не произошло, потому что очень сильно протекает в районе люстры. Года два назад нам меняли кровлю, но от этого меньше течь не стало. Обещали, что придет инженер из ЖЭСа, но его не было. Насчет капитального ремонта? Говорят — "завтра". А у нас балкон постепенно рушится, уже большой кусок отвалился, балкон у нас, между прочим, прямо над тротуаром.

Сергей высказал также свое недовольство по поводу автостоянки, устроенной во дворе:

— Невозможно даже мусор выкинуть, все загородили своими машинами.

Выслушав возмущения жильцов, я обратился в 15-й ЖЭС, который обслуживает эти дома. Меня послали в ЖРЭУ, где инженер Раиса Леонтьевна Бабич сказала: "Нет денег. В 2003 году планируется отремонтировать фасад, а изнутри дом до 2006 года ремонтировать не будем".

Что же касается автостоянки, то в приемной начальника ЖЭСа №15 мне заявили: "Вам в ГАИ надо обращаться".

Похоже, по-настоящему встряхнутся чиновники только тогда, когда и в самом деле на иностранца упадет балкон. Я же могу только сказать: не ходите по улице Володарского или надевайте каску!..

Павел АРТЮШКЕВИЧ.
Фото автора.



РЭПЛІКА

Пры чым тут Джэк Лондан?

Аўтара матэрыяла "Судьба белорусского Джека Лондона" ("Народная воля" за 11.03.2003 г.) можна было вылічыць па почырку — з'едлівым тоне, "закідонах" у розныя бакі, літаратурных асацыяцыях. Сямён Букчын зноў з кімсьці змагаецца. Гоніць хвалю пры, здавалася б, высакароднай нагодзе — адкрыць чытачам невядомага пісьменніка, нашага земляка Барыса Казанава. Вельмі верагодна, што празаік гэты сапраўды здольны і варты ўвагі. Мне, праўда, не даводзілася чуць яго імя ні ў якім кантэксце. Сам С.Букчын не ўпэўнены, да беларускай яго літаратуры аднесці ці да рускай, што не перашкодзіла яму згадаць "пятую графу" і папракнуць ранейшы Саюз пісьменнікаў за дыскрымінацыю па нацыянальнай прыкмеце. Нібыта "бдительные члены приемной комиссии президиума" лёгка вылічылі "яўрэйскія штучкі" ды сталі сцяной на абарону суполкі ад "упрямого и самолюбивого" баксёра з Магілёва.

У пісьменніцкую арганізацыю, трэба сказаць, не прымаюць з-за розных прычын. Падчас з-за таго, што прэтэндэнт лічыць ніжэй гонару проста напісаць заяву (чакае, што паклічуць). Падчас Фартуна падводзіць (бо непрадказальная). А часцей на самай справе літбагаж малаваты і мастацкія якасці пад пытаннем. Але ніяк не па той прычыне, за што папракае Саюз аўтар матэрыяла. Без цяжкасцей сталі ў свой час яго сябрамі Навум Кіслік, Аляксандр Дракахруст і многія іншыя. Па першай кніжцы прынялі самабытнага паэта Фелікса Баторына. (І ніхто не ківаў яму, дарэчы, за псеўданім.) Аднак прыёмныя камісіі, дакладна ведаю, коса паглядаюць на маладых і не вельмі, якія лаўчаць, шукаюць хады-выхады, абачліва заручаюцца падтрымкай знаных ды знакамітых. Відаць, невыпадкова "волчонок" звярнуўся па рэкамендацыю аж да Васіля Быкава...

С.Букчын красамоўна апісвае перыпетыі жыцця Б.Казанава, каго лёс заносіў то на Урал, то зноў на Беларусь, то ў Ізраіль. Менавіта там ён выдаў яшчэ адну кнігу пад назвай "Роман о себе" (самазнішчальная, як, на мой погляд, назва!). Гэта, мабыць, сапраўды "расчет с прошлым", так што ваша першае ўражанне, Сямён, было дакладным. Не такая ўжо рэдкая з'ява — звядзенне рахункаў з жывымі і мёртвымі...

Але справа не ў тым — справядліва ці не "абгадзіў" Б.Казанаў сваіх былых сяброў і таварышаў (бо ў СБП ён усё ж прабіўся). Справа ў тых пастаянных наскоках на нашу пісьменніцкую брацію з боку самога Сямёна Букчына, публіцыста актыўнага і вядомага. Не адпавядаем мы яго ідэалам — ну хоць ты плач! Да дзеячаў навукі, да тэхнічнай інтэлігенцыі, што характэрна, — аніякіх прэтэнзій, да мастакоў, тэатралаў — таксама. Усім дазваляецца думаць як думаюць і жыць як жывуць, толькі не нам! Вось вам прыклад: не паспеў Алесь Пашкевіч узначаліць Саюз беларускіх пісьменнікаў і даць першае інтэрв'ю, як С.Букчын расчахліў гармату і грымнуў на ўсю моц. Бо пазіцыя, бачыце, у маладога старшыні не настолькі радыкальная, як некаму хацелася б.

Дазвольце спытаць: ці можа быць дэмакрат мізантропам і, наадварот, мізантроп — дэмакратам? Ці мае на мэце дэмакратыя ўсіх паставіць у адзін строй і апрануць у аднолькавую форму? А да Саюза пісьменнікаў, па-мойму, "няроўна дыхае" альбо той, хто сам прымервае лаўры мастака слова, альбо той, хто не мае магчымасці на яго, Саюз, уплываць.

І апошняе, у сувязі з інфармацыяй пра Б.Казанава: я так і не ўцяміла, **пры чым тут Джэк Лондан?** Пакіньце класікаў у спакоі! Што гэта ўвогуле за мода — прыўзнімаць супляменнікаў, прыніжаючы пры гэтым іншых — што "не пушчалі", недаацэньвалі, не давалі дарогі... Паспрабавалі б яны вас, Сямён, некуды не пусціць!

Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ.

Дырэктара — да адказнасці

У дачыненні да дырэктара Віцебскага дзяржаўнага ПТВ №37 машынабудавання імя Шмырова ўзбуджана крымінальная справа. Яна заведзена па прыкметах злачынства, прадугледжанага часткай 3 артыкула 210 Крымінальнага кодэкса Беларусі — крадзеж шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі.

Як паведамілі БелаПАН у прэс-службе Камітэта дзяржаўнага кантролю (КДК), упраўленнем дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК па Віцебскай вобласці ўстаноўлена, што дырэктар ПТВ на працягу 2001—2002 гадоў, выкарыстоўваючы свае службовыя паўнамоцтвы, выкраў падсправаздачныя грашовыя сродкі на суму 1 млн. 830 тыс. рублёў.

Генадзь ШАРЫПКІН.

Трывожыць «разбойная» статыстыка

Па статыстыцы 2002 года ў Беларусі разбойныя напады ўчыняліся на 30 працэнтаў часцей, чым у папярэднім годзе, а грабяжы — на 17 працэнтаў. Адмоўная тэндэнцыя захоўваецца і сёлета. Паводле аператыўных звестак, за 20 дзён лютага на тэрыторыі рэспублікі колькасць грабяжоў рэзка ўзрасла — на 50 з лішкам працэнтаў, разбояў — на 54,5 працэнта. Найбольш неспрыяльная абстаноўка склалася ў Брэсцкай вобласці.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

Напалі на сельскую краму

У Баранавіцкім раёне затрымалі двух маладых чалавек, што падазраюцца ва ўчыненні дзёрзкага ўзброенага нападу на сельскую краму.

Вечарам 15 сакавіка падазроныя зайшлі ў краму вёскі Ястрэмбель Баранавіцкага раёна. Адзін з іх параніў 40-гадовую загадчыцу нажом у правае плячо. Пасля гэтага яны забралі выручку ў суме 400 тысяч рублёў і збеглі. Загадчыца выклікала міліцыю і хуткую дапамогу.

У Баранавічах, Баранавіцкім раёне і Ляхавічах быў уведзены план "Сірэна". Праз некалькі гадзін у пасёлку Мірны Баранавіцкага раёна падазроных затрымалі. 19-гадовы раней судзімы Аляксандр Я., жыхар вёскі Малая Каўпяніца. Яго хаўрусніку Аляксандру К., жыхару вёскі Адахоўшчына, паляводу калгаса імя Кірава, сёлета споўнілася 18 гадоў. У іх канфіскаваны 227 тысяч рублёў, каньяк і цыгарэты.

Валянціна КАЗЛОВІЧ.

Как я не стал фермером

Решился я, хорошенько все обдумав и взвесив, на серьезное дело — завести крестьянско-фермерское хозяйство. В нашем Переровском сельском Совете как раз есть фонд земель для создания таких хозяйств. Туда я и обратился, подготовив предварительно кипу всяческих документов, с просьбой выделить мне для благой цели 7 га пашни и 4 га сельхозугодий. Поскольку в деревне все люди на виду, в сельсовете хорошо знают то, что я люблю и умею работать на земле. Здесь положительно оценили мою программу развития хозяйства и без лишних заморочек стали ходатайствовать перед Житковичским райисполкомом об удовлетворении моей просьбы.

Через некоторое время районный землеустроитель Волчик сообщил, что меня пригласят, когда будет решаться мой вопрос. Только надо подождать. Ждал я, ждал, но все было глухо. Опять обратился к тому самому Волчику, и на этот раз он мне сказал, что дело не выходит: директор агрокомплекса "Хлупин" В.Шевчук — против. И посоветовал просить согласия выше у руководства Национального парка "Припятский", на территории которого расположен вышеназванный агрокомплекс. Хотя раньше уверял, что такого согласия не нужно.

Сотрудник аппарата Управления делами президента (а именно в его ведении находится Нацпарк) Новик обрадовал, не высказав возражений своей службы против моего намерения, но отослал при этом все к той же начальнице В.Шевчук: она, мол, все и решит. Та же в свою очередь сослалась на отсутствие полномочий, отправив к генеральному директору парка С.Бамбизе. А тот — ну не удивительно ли — тоже, как оказалось, не имеет этих самых полномочий, считая, что они есть у более высокой начальницы — управляющей делами президента...

Так и крутится вхолостую эта карусель, а вернее, канитель: бумаги, хождения, прошения, унижения, отказы: никто из чиновников самых разных уровней не отваживается решить, казалось бы, обыденный житейский вопрос — в масштабах государства пустяковый, а для меня жизненно важный. Неужели без самого-самого главного руководителя они по-деловому решить ничего не могут и мне придется беспокоить президента страны?

А ведь не подаяние выпрашиваю — хочу производить для наших же людей продукты питания. Имею для этого достаточно сил, опыта и знаний. Работал в свое время агрономом в колхозе "Ленінскі шлях", добивался высоких урожаев. Ныне тем, что выращиваю на приусадебном участке в 40 соток, обеспечиваю свою семью и домашнюю ферму, да еще продаю около 20 тонн овощей. Часть продукции реализовывал через торговую сеть Нацпарка.

Всю жизнь мы с семьей посвятили труду в сельском хозяйстве. У меня трое детей, надеюсь, и у них не охладеет родительская тяга к земле. Мы много можем сделать на ней. Но, как видите, я все еще не стал фермером. Душа болит, когда видишь, как зарастает земля без хорошего хозяина. Как многие, желавшие дать ей новую жизнь на пользу себе и людям, помытарившись, как я, махнули на все рукой и стали искать счастья в иных, как говорится, сферах. Кому от этого, спрашивается, выгода? Не пора ли, наконец, расстаться со лживой, глупой, навязываемой народу присказкой типа "фермеры страну не накормят", и можно претендентов на это "звание" не пущать, сеять к ним недоверие и неприязнь.

Что — колхозы, в которые столько вбухано средств, накормили? А фермеры в цивилизованных странах кормят весь мир. И мы не хуже. Дайте нам хотя бы немного понимания и поддержки, и дело пойдет.

В общем, мы с семьей уезжать никуда не собираемся и надеемся, что мечта о кусочке земли, где можно хозяйствовать с умом и душой, все же сбудется.

С.ЖУРАВЛЕВИЧ,
житель д.Хлупин
Житковичского района.

Народная Воля 18 САКАВІКА 2003 г.

НАШЫ ЗА МЯЖОЙ

«Мірон» у Бельгії

Мінулагодні серыял "Народнай волі" пра беларускіх уцекачоў, якія знайшлі пастаянны прытулак у гасціннай Бельгіі, выклікаў цікавасць сярод чытачоў газеты. Мы вырашылі зноў наведаць былых суайчыннікаў, пагутарыць пра жыццё-быццё за мяжой, адказаць на іх шматлікія пытанні пра тое, што адбываецца зараз на Беларусі.

Адразу адзначу, што сустракаўся я не з выбітнымі палітычнымі дзеячамі, а са звычайнымі людзьмі, якім проста абрыдла кожны дзень на Радзіме змагацца з хранічнай галечай, з "пільнай" міліцыяй, якая збівае на акцыях пратэсту грамадзян, з адсутнасцю перспектыў для дзяцей...

Віцебскі высакавольтны верхалаз

Зміцер Піменаў — тыповы палітычны ўцякач. У родным Віцебску на яго была заведзена крымінальная справа ў сувязі з актыўнасцю падчас байкоту парламенцкіх выбараў 2000 года. Спачатку Зміцера прымушалі заплаціць штрафы ў 50 і 150 "мінімалак", пазней завялі справу. Потым арыштавалі, таму што не мог і не збіраўся Зміцер "падтрымліваць злачынную ўладу", выплачваючы гэтыя касмічныя штрафы. Вызваліўшыся часова з пастарунку, ён вырашыў "навастрыць лыжы" на Захад.

Піменаў распавёў мне пра такую з'яву (менавіта пра з'яву, а не пра чалавека), як Мірон. Высветлілася, што ён — адзін з тых Міронаў. У яго актыве — тры акрабатычных нумары з вывешваннем бел-чырвона-белых сцягоў у небяспечных кропках. Адзін з іх лунаў над плошчай Перамогі ў Віцебску, другі — над рэчкай Віцьбай насупраць гарвыканкама, а трэці — на апоры лініі электраперадач (ЛЭП) пад Віцебскам. "Акрамя мяне было яшчэ два актыўных Міроны, усе з-пад Віцебска. Самы першы жыве і зараз у Лёзне. Калі вы самі вывесіце заўтра дзе-небудзь сцяг, вы таксама будзеце Міронам!", — кажа мне спадар Піменаў.

Каб закінуць сцяг на ЛЭП, віцебскі Мірон разам з сябрам рабілі адмысловае прыстасаванне — самастрэл, які страляў лёскай са сцягам. "Трэба, — кажа Зміцер, — каб лёска пералятала толькі праз адзін высакавольтны дрот. Зрабіць гэта даволі цяжка, але заўсёды лічылася своеасаблівым шыкам Мірона павесіць сцяг на самы верхні дрот".

Працавалі звычайна ўдвух, таму што аднаму чалавеку зрабіць гэтую справу практычна немагчыма. Высокае напружанне і, адпаведна, небяспека для жыцця. Мірон рабіў усё, каб зрабіць гэтую справу больш бяспечнай — абуваў гумовыя боты і надзяваў пальчаткі.

Да эміграцыі ў Бельгію Піменаў, дарэчы, меў сваю ўласную фірму, потым, пасля банкруцтва, займаўся рамонтам машын, крыху падрабляў вартаўніком. Жонка таксама была ў бізнесе — мела ў Віцебску свой невялічкі гандлёвы шапік. Піменавы ніколі не думалі пра эміграцыю, але калі ўзнікла пагроза турмы для карміцеля, вырашылі з'ехаць.

"Што вас, прадпрымальніка, вымусіла рызыкаваць жыццём і лезці на апору высакавольтнай лініі? — пытаю. "Дух, — адказвае Мірон. — Калі лунаюць нашы нацыянальныя сцягі, калі ёсць людзі, якія здольныя рызыкаваць уласным жыццём, тады жыве Беларусь!"

Зараз муж і жонка Піменавы разам з сынам Ігарам чакаюць статуса ўцекачоў. Адразу пасля прыезду за мяжу ў снежні 2000 года ў Зміцера былі праблемы з мясцовымі ўладамі. Ён забыўся ўзяць неабходныя паперы, а ў бельгійскім Камісарыяце па справах уцекачоў яму спачатку не паверылі і нават збіраліся дэпартаваць. Потым жонка паперы прывезла, і сям'і дазволілі застацца. Пакуль часова. Сядзяць яны на так званым "сацыяле" — кожны з дарослых членаў сям'і атрымлівае па 550 еўра (альбо 1.210.000 беларускіх рублёў) у месяц ад бельгійскай дзяржавы.



Ігар і Зміцер Піменавы.



Леанід Васючэнка.

Спрабавалі знайсці працу, але пакуль не знайшлі.

Жонка, як кажа Зміцер, "з разуменнем", таму актыўна вывучае нідэрландскую мову, на якой размаўляе палова насельніцтва краіны, і займаецца "інтэграцыяй у бельгійскае грамадства". Дарэчы, дома ў Піменавых размаўляюць выключна па-беларуску.

Зняць даволі добрую кватэру ў Бельгіі, кажа Зміцер, можна прыкладна за 200—400 еўра ў месяц. Пасля аплаты жылля застаецца каля 700 еўра на сям'ю на месяц. Прадукты харчавання ў большасці танней, чым у Беларусі, і існуе вялікі выбар. Бытавую тэхніку і шмат чаго з адзення эмігранты набываюць па дэмпінгавых цэнах ці наогул бясплатна.

Але Зміцер Піменаў выглядае не надта шчаслівым: "Дома, у Беларусі, я меў больш грошай, чым тут. Я тут бедны. Мяне жыццё за мяжой не задавальняе. Калі б Лукашэнка выдаў амністыю, я, магчыма, вярнуўся б дамоў".

Былы целаахоўнік Чыгіра

З 1996 па 1999 год Леанід Васючэнка з'яўляўся актывістам БНФ, жыў на вуліцы Мірашнічэнкі ў Мінску. Падчас альтэрнатыўных прэзідэнцкіх выбараў у 1999 годзе Лёня працаваў целаахоўнікам і вадзіцелем у былога прэм'ер-міністра і кандыдата ў прэзідэнты Міхаіла Чыгіра. Як засведчыў "Народнай волі" сам Міхаіл Мікалаевіч, "Васючэнка хлопец гарачы, у адказ на абразу заўсёды ўступіць у бойку". Гарачы тэмперамент Леаніда паслужыў, мусіць, адной з прычын яго эміграцыі. Тым не менш тут, у Бельгіі, Васючэнку звычайна называюць "бульбай"...

Аднойчы Лёня трапіў за мяжой у вельмі непрыемную гісторыю, ледзь застаўся жывым. Калі ён знаходзіўся ў лагеры для ўцекачоў "Пеці Шато" у жніўні 2000 года, пазнаёміўся з былымі мінчанамі Уладзімірам Гермацкім і Сяргеем Дзянкевічам. Гермацкі, каб атрымаць палітычны прытулак і магчымасць жыць у Бельгіі, прыдумаў для мясцовых улад гісторыю, што нібы служыў у спецназе сумнавядомага Паўлічэнкі і што яму загадвалі забіваць людзей, але ён нібы адмаўляўся. Васючэнка лічыць, што ўсё гэта хлусня.

Новы "сябар", былы суайчыннік Гермацкі спачатку скраў у Лёні Васючэнкі мабільны тэлефон, а потым прывёз да яго цэлую брыгаду, якая складалася з трох рускіх, двух беларусаў, аднаго ўкраінца і трох чэчэнцаў. "Брыгада" звязала Лёню, моцна збіла... Патрабавалі ў яго 1,5 тысячы еўра і нарэшце ўзялі ў заложнікі. Прыстаўлялі да горла нож, некалькі раз пагражалі, што заб'юць.

Грошай у Васючэнкі не было, і былы ахоўнік Чыгіра вырашыў звярнуцца за дапамогай да старшыні Беларускага цэнтра ў Бельгіі Ігара Лазарчука. Ігар выйшаў на сувязь. Аднак браткі-славяне, якія вырашылі раптам стаць тэрарыстамі, паспрабавалі запужаць і Ігара. Але ён не разгубіўся і патэлефанаваў у паліцыю, потым — у антытэрарыстычны цэнтр.

У мясцовай паліцыі не зразумелі пагрозы для жыцця эмігранта, нават смяяліся і не верылі, што за заложніка патрабуюць такую малую суму. Паліцыянты вырашылі праблему арыгінальна: яны патэлефанавалі да тэрарыстаў і спыталі, ці праўда тое, што яны ўзялі заложніка і патрабуюць 1,5 тысячы еўра. Злачынцы, крыху разгубіўшыся, Леаніда развязалі і, як ён адчуваў, збіраліся забіць. Для гэтага меліся сур'ёзныя падставы, і яшчэ Лёня прыняў да увагі, што зніклых уцекачоў у Бельгіі амаль ніхто не шукае.

